виться к занятиям, детально изучать учебный материал, что стимулирует самостоятельную работу и познавательную активность учащихся.

Во время занятий по дисциплине «Иностранный язык» с использованием ИЭУМК «Иностранный язык. Английский язык» для специальности 6-05-0112-02 Начальное образование формируются и развиваются коммуникативные навыки, навыки говорения, монологической и диалогической речи в сфере социально-бытового общения, учебно-познавательной сфере, в сфере социокультурного общения, углубляются знания студентов в сфере педагогики, совершенствуется профессионально-языковая компетенция.

Таким образом, представленный инновационный ресурс отвечает всем современным тенденциям развития системы образования в Республике Беларусь и является эффективным инструментом повышения мотивации обучающихся за счет его интерактивных составляющих, разнообразия включенного материала и его универсальной подачи.

### Библиографический список


1. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda/%D0%BA%D0%BE%D0%BD%D1%86%D0%B5%D0%BF%D1%86%D0%B8%D1%8F.pdf – Дата доступа: 03.09.2023
2. Иностранный язык. Английский язык для специальности 6-05-0112-02 Начальное образование: Н. П. Цикото, Т. Г. Вайтехович [Электронный ресурс] // СДО Moodle / Белорус. гос. пед. ун-т. - Свид. о гос. рег. информац. ресурса № 1142335415 от 28.07.2023 г. Режим доступа: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=5763 – Дата доступа: 03.09.2023
3. Иностранный язык. Учебная программа учреждения высшего образования по учебной дисциплине для специальностей для специальностей: 6-05-0112-01 Дошкольное образование 6-05-0112-02 Начальное образование 6-05-0113-01 Историческое образование 6-05-0113-02 Филологическое образование (Белорусский язык и литература) 6-05-0113-02 Филологическое образование (Русский язык и литература) 6-05-0113-03 Природоведческое образование 6-05-0113-06 Художественное образование 6-05-0113-07 Музыкальное образование 6-05-0114-01 Социально-педагогическое и психологическое образование 6-05-0313-01 Психология 6-05-0921-01 Социальная работа 7-07-0114-01 Специальное и инклюзивное образование [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/59538 – Дата доступа: 03.09.2023
4. Цикото, Н. П. Использование интерактивного электронного учебно-методического комплекса в процессе обучения английскому языку / Н. П. Цикото // Преподавание иностранных языков в поликультурном мире: традиции, инновации, перспективы : сборник статей V Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 23 марта 2023 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : В. Д. Стариченок [и др.]. – Минск : БГПУ, 2023. – С. 87–90.


# АСАБЛІВАСЦІ АНАМАСІЯЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ЛІНГВІСТЫЦЫ


***Ю. М. Чагайда (Брэст, Беларусь)***


Шматвяковая гісторыя вывучэння мовы дэманструе цікавасць даследчыкаў да пытання вызначэння асноўных моўных функцый, у лік якіх уваходзіць і намінатыўная. Выступаючы ў якасці першаснай функцыі мовы, яна ўказвае на “здольнасць моўнай сістэмы называць фрагменты рэчаіснасці, фарміруючы паняцці аб іх у выглядзе слоў, спалучэнняў слоў, фразеалагізмаў і сказаў” [9, с. 336]. Вывучэннем пытання наймення фрагментаў навакольнай рэчаіснасці як з дапамогай слоў, так і з дапамогай цэлых выказванняў займаецца анамасіялогія,

якая ўключалася спачатку лінгвістамі ў склад семасіялогіі або лексікалогіі, якая, як адзначае Ю. С. Сцяпанаў, "паступова стала ядром семантыкі" [8, с. 353]. Прайшоўшы шлях ад першых здагадак пра існаванне сістэмнасці ў лексіцы да прызнання кагнітыўнай абгрунтаванасці катэгорый, з канца XX стагоддзя тэорыя намінацыі займае важнае месца ў лінгвістычных даследаваннях.

Выдзяленне анамасіялогіі ў самастойны навуковы напрамак звязана з імем А. Цаўнера, які ўпершыню супрацьпаставіў анамасіялагічны напрамак семасіялагічнаму. У яго разуменні анамасіялагічны аналіз "азначае разгляд намінатыўнага працэсу ад названай рэаліі да намінацыі, а не наадварот, як гэта адбываецца пры семасіялагічным аналізе" [5, с. 22]. Важную ролю для развіцця анамасіялогіі сыгралі таксама працы заходнееўрапейскіх навукоўцаў (Р. Мерынгер, Б. Квадры, Г. Шухардт, Л. Вейсгербер, К. Бальдынгер), дзякуючы якім у сярэдзіне XX стагоддзя "анамасіялогія становіцца навуковым напрамкам са сваім метадалагічным апаратам" [5, с. 21].

У расійскім мовазнаўстве на неабходнасць выдзялення анамасіялогіі як асобнага раздзела лінгвістыкі адным з першых указаў І. С. Торапцаў, які на працягу шэрагу гадоў распрацоўваў асновы анамасіялогіі – навукі аб словавытворным працэсе. Яго працы грунтуюцца на стварэнні новых лексічных адзінак і рэалізацыі пераходу ад лексічна нявыяўленага зместу да вербальнага. Спецыфіка намінатыўнага акта, па словах вучонага, яшчэ больш "падкрэсліваецца тэзісам аб асаблівым анамасіялагічным кантэксце, які не ўваходзіць у камунікатыўны, выбіваецца з яго і стварае новую лексічную адзінку" [11, 3–29]. Прапанаваная даследчыкам канцэпцыя ў большай ступені адпавядае задачам практычнай навукі аб намінацыі, бо канцэнтруе ўвагу на самом факце зараджэння імя, неабходнага для абазначэння новай рэаліі.

Асаблівай увагі заслугоўваюць працы Э. С. Азнауравай, У. Р. Гака, Г. У. Калшанскага, А. С. Кубраковай, М. В. Нікіціна, А. М. Пазняковай, А. А. Селіванавай [12, с. 21], у якіх вывучаліся пытанні намінацыі з пазіцый мовамысліцельнай дзейнасці. Асвятляючы гнасеалагічныя падставы намінатыўнай дзейнасці, яе сувязь з прадметна-пазнавальнымі працэсамі, характарызуючы семіятычныя аспекты намінацыі, дадзеныя прадстаўнікі анамасіялагічнага напрамку апярэдзілі многія ідэі кагнітыўнай навукі. У цэнтры ўвагі даследаванняў знаходзяцца праблемы намінатыўнай функцыі мовы, намінатыўныя аспекты моўных адзінак і ўсёй маўленчай дзейнасці, асаблівасці актаў намінацыі, якія ажыццяўляюцца з дапамогай розных сродкаў і сістэм і г. д. У працах названых аўтараў адлюстроўваюцца таксама ўласна кагнітыўны, пазнавальны падыход да вывучэння намінатыўнай дзейнасці і асаблівасці ствараемых у гэтых працэсах структур ведаў, якія аб'ектываваны ў актах намінацыі. Гэтая пазіцыя выразна выказана ў працах Г. Калшанскага, на думку якога "сутнасць намінацыі заключаецца не ў тым, што моўны знак абазначае рэч ці якім-небудзь чынам суадносіцца з рэччу, а ў тым, што ён рэпрэзентуе якую-небудзь абстракцыю як вынік пазнавальнай дзейнасці чалавека" [1, с. 78–79]. На думку В. М. Тэліі, "магчымасць апасродкаванага адлюстравання рэчаіснасці крыецца ў здольнасці славесных знакаў захоўваць і перадаваць паняційны змест, які гістарычна замацоўваецца за дадзеным словам у выглядзе яго лексічнага значэння, задавальняючы класіфікацыйным і разумова-камунікатыўным працэсам ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці" [10, с. 73–98].

Для анамасіялогіі як навуковага напрамку характэрны розныя падыходы да яе даследавання. Адзін з іх звязаны з фарміраваннем тэарэтычнай базы вучэння аб намінацыі. Відавочна, што анамасіялагічны напрамак лінгвістычнай навукі дасягнуў у гэтым значных поспехаў. У працах такіх аўтараў, як Н. Д. Аруцюнава, У. Р. Гак, Н. Д. Голев, В. П. Даніленка, А. Ф. Жураўлёў, Г. У. Калшанскі, М. Г. Комлеў, А. С. Кубракова, В. А. Кудраўцава, Б. А. Сярэбранікаў, В. М. Телия, Г. А. Уфімцава [12, с. 21] і інш., знайшлі падрабязнае апісанне параметры намінатыўнай сітуацыі, а таксама атрымала дэталёвую распрацоўку агульная тыпалогія намінацый і відаў найменняў. З іншага боку, паслядоўна развіваецца вывучэнне намінацый ва ўласна лінгвістычным аспекце, пры якім "фактычна не вывучаецца намінатыўная лексіка ў яе пра-

мым ужыванні і асноўны акцэнт пераносіцца на выкарыстанне ўжо наяўных у мове намінатыўных сродкаў у новай для іх функцыі нарачэння” [10, с. 129]. Дадзены падыход прадстаўлены ў працах, прысвечаных намінацыям ў паэтычнай мове і іншых відах тэкстаў [12, с. 22].

Распрацоўка палажэнняў тэорыі і практыкі намінацый паслядоўна праводзіцца ў даследаваннях, прысвечаных тым ці іншым групам намінатыўнай лексікі: навуковай і народнай тэрміналогіі, наменклатуры раслін, таварных знаках, розных класах уласных імёнаў і г. д. У канкрэтных анамасіялагічных апісаннях намінатыўнага матэрыялу адпрацоўваецца тэрміналогія, выяўляюцца неабходныя характарыстыкі, якія вызначаюць своеасаблівасць тых ці іншых намінатыўных сістэм. У працах рускіх (А. Л. Беразовіч, М. Д. Голева, М. В. Галамідавай, Т. А. Грыдзінай, Л. М. Майданавай, Н. І. Мігірынай, М. Э. Рут, Т. У. Чарнышовай, В. І. Шахоўскага) і беларускіх даследчыкаў (А. І. Копача, С. Г. Ляскевіч, І. Э. Ратнікавай, Т. Р. Трафімовіч) [12, с. 22], а таксама іншых навукоўцаў распрацавана методыка збору намінатыўнага матэрыялу ў палявых умовах і ўмовах лінгвістычнага эксперыменту, дадзены пэўныя рэкамендацыі па найменні і перайменаванні розных рэалій, стварэнні навуковых і наменклатурных тэрмінаў.

Значны ўклад у распрацоўку праблем і прынцыпаў тэорыі намінацыі і анамасіялогіі як навуковага напрамку ўнеслі даследаванні, прысвечаныя намінацыям асобы як у сістэме мовы, так і ў мастацкім тэксце. Так, на матэрыяле асобных лексіка-семантычных груп намінацый асобы распрацоўваліся палажэнні аб узроўневай арганізацыі лексічнай сістэмы, аб будаванні асобнага лексічнага значэння, аб выкарыстанні метаду кампанентнага аналізу ў дачыненні да намінацый асобы [12, с. 22]. Сярод работ, прысвечаных анамасіялагічнаму вывучэнню намінацый асобы ў сістэме мовы і тэксце, варта адзначыць дысертацыйнае даследаванне К. С. Мейрманавай [3]. Аўтар разглядае сістэмна-структурныя, канататыўна-стылістычныя і тэкставыя аспекты намінацыі асобы ў сучаснай нямецкай мове. Праца ўяўляе сабой комплекснае тыпалагічнае даследаванне назваў асобы ў сістэме мовы з улікам колькасных і якасных паказчыкаў і ў тэксце з мэтай вызначэння іх функцый і ролі ў мастацкай прозе.

Асобную групу складаюць даследаванні, прысвечаныя вывучэнню намінацый асобы на матэрыяле фразеалагізмаў. Так, у працы К. Р. Ратушнай праводзіцца комплекснае даследаванне фразеалагічнага значэння на матэрыяле фразеалагізмаў-антрапанамінантаў, якія разам з асабістымі імёнамі складаюць адзіную лексіка-фразеалагічную сістэму сродкаў намінацыі чалавека ў рускай мове, вывучаецца граматычная семантыка фразеалагізмаў-антрапанамінантаў, выяўляюцца заканамернасці ўзаемадзеяння семантычных і граматычных уласцівасцяў фразеалагізмаў, усталёўваецца ступень і характар уплыву фразеалагічнай семантыкі на функцыянаванне граматычных катэгорый, а таксама сінтаксічная спецыфіка даследуемых адзінак [6].

У шэрагу навуковых прац называліся прыкметы, на падставе якіх можа быць вызначана тэматычная арганізацыя класа намінацый асобы: гендарная прыналежнасць, род заняткаў, прыналежнасць да грамадскіх груп, нацыянальная прыналежнасць, месца жыхарства, унутраныя якасці чалавека, сацыяльнае становішча, узрост і інш. [12, с. 23]. Напрыклад, у работах А. І. Маісеева разглядаюцца намінацыі асоб па прафесіі на матэрыяле рускай мовы ў структурна-семантычным аспекце [4]. Аўтар дае агульную характарыстыку дадзенага класу слоў, вылучаючы іх з больш шырокага кола моўных адзінак і тым самым адмяжоўваючы ад сумежных найменняў асоб па пасадзе, захапленням, заняткам і г. д. Работы А. І. Маісеева прыцягваюць увагу лінгвістаў у сілу шырокасці моўнага матэрыялу і яго структурна-семантычнай разнастайнасці. У даследаванні Н. В. Яшчанка прадстаўлена дынаміка развіцця спосабаў намінацыі асоб жаночага полу ў пэўныя гістарычныя перыяды і вызначана ўзаемасувязь паміж гістарычна зменлівай роляй жанчыны, тэматыкай і спосабамі стварэння намінацый асоб жаночага полу ў дыяхраніі, разгледжаны ўплыў экстралінгвістычных фактараў на напрамак развіцця і колькасныя змены ў фарміраванні новых намінацый асоб жаночага полу [14]. Аснову дысертацыйнай работы беларускага даследчыка А. У. Ксяндзовай складаюць намінацыі чалавека з пункту гледжання яго знешняга выгляду, якія ўжываюцца ў гаворках

беларускай мовы. Аўтарам вывучаны лінгвагеаграфія, паходжанне, матывацыя дадзеных намінатыўных адзінак, а таксама разгледжаны спосабы лексічнага ўвасаблення матывацыйных прыкмет ў адпаведных назвах [2]. У адзначаных працах праведзены комплексны аналіз функцыянавання намінацый асобы на матэрыяле асобных лексіка-семантычных груп, вызначаны прынцыпы іх класіфікацыі і фактары, якія абумоўліваюць спецыфіку іх ужывання.

Пытанні, звязаныя з даследаваннем намінацый асобы на матэрыяле мастацкіх тэкстаў, разглядаліся ў працах Д. М. Магамедавай і М. І. Гарэлікавай, В. М. Гуцалюк, С. І. Зініна, Э. Б. Магазініка, І. А. Марынінай, А. В. Салаўёвай, Я. А. Фраловай і інш. [12, с. 24]. Падрабязнае тэарэтычнае асвятленне ў навуковай літаратуры атрымала вывучэнне ўласных імёнаў, што адлюстравана ў шматлікіх даследаваннях анамастычных сістэм канкрэтных мастацкіх тэкстаў і ў даследаваннях па тэорыі ўласных імён ў мове мастацкіх твораў [там жа].

У беларускай лінгвістыцы сярод анамастычных даследаванняў значнае месца займаюць працы В. В. Шура і А. Ф. Рогалева. Так, у даследаванні В. В. Шура выяўлены і сістэмна апісаны семантыка-стылістычныя асаблівасці онімаў (уласных імёнаў, мянушак, тапонімаў) у творах беларускіх пісьменнікаў, устаноўлены тыповыя асаблівасці і заканамернасці функцыянавання онімаў у аспекце камунікатыўна-прагматычнай і сінтагматыка-парадыгматычнай арганізацыі мастацкага тэксту, адзначана роля узуальных і аказіянальных сродкаў у ўтварэнні канатацыйных значэнняў літаратурных онімаў, апісаны з’явы апелятывацыі, анімізацыі і этымалагізацыі ў анамастычных адзінках [13]. А. Ф. Рогалеў на анамастычным матэрыяле, узятым з твораў рускай класічнай літаратуры, у сваім даследаванні «Анамастыка мастацкіх твораў» падрабязна аналізуе функцыі ўласных імёнаў (паэтонімаў) як неад’емных кампанентаў стылю пісьменніка і сродкаў мастацка-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці [7]. Аўтар паслядоўна кваліфікуе паэтонімы як структурныя элементы вобразнай сістэмы твораў, вызначае іх мастацка-эстэтычную неабходнасць у тэксце, класіфікуе тыпы імёнаў літаратурных і фальклорных персанажаў. У даследаваннях названых аўтараў анамастычны намінатыўны матэрыял разглядаецца як важнейшы тэкстаўтваральны сродак мастацкага твора, як носьбіт нацыянальна-культурнага кампанента ў тэксце.

Такім чынам, разнастайнасць названых падыходаў і напрамкаў па вывучэнні намінатыўнага матэрыялу дазваляе ўсталяваць залежнасць працэсу наймення ад жанравай і кампазіцыйнай накіраванасці тэксту, вызначыць пераважнае выкарыстанне тых ці іншых спосабаў намінацыі, выявіць і апісаць асноўныя рысы сістэмы намінацый асобы, у прыватнасці, асаблівасці іх анамасіялагічных структур, а таксама разгледзець моўныя адзінкі з пазіцыі перакладу пазамоўнага зместу ў канкрэтную моўную форму.

## Бібліяграфічны спіс


1. Колшанский, Г. В. Соотношение субъективных и объективных факторов в языке / Г. В. Колшанский. – М. : Высш. шк., 1975. – 327 с.
2. Ксяндзова, А. У. Назвы чалавека паводле знешняга выгляду: лінгвагеаграфічны і анамасіялагічны аналіз : дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / А. У. Ксяндзова. – Мінск, 2008. – 132 л.
3. Мейрманова, К. С. Номинации лица: текстообразующие потенции и функционирование в тексте / К. С. Мейрманова // Номинация и словообразование (Немецкий язык) : сб. науч. тр. – Калинин : Изд-во Калинин. гос. ун-та, 1989. – С. 64–72.
4. Моисеев, А. И. Наименования лиц по профессии в современном русском языке (структурно-семантическая характеристика) : автореф. дис. ... д-ра филол. наук / А. И. Моисеев ; Ленингр. гос. ун-т. – Л., 1968. – 27 с.
5. Новикова, Е. Ю. Структура, семантика и тенденции развития наименований лиц по профессии в современном немецком языке : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Е. Ю. Новикова. – М., 2006. – 221 л.

6. Ратушная, Е. Р. Антропономинирующая парадигма русской фразеологии: семантика, формирование, функционирование : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / Е. Р. Ратушная ; Курган. гос. ун-т. – Курган, 2001. – 51 с.
7. Рогалев, А. Ф. Имя и образ : художественная функция имен собственных в литературных произведениях и сказках / А. Ф. Рогалев. – Гомель : БАРК, 2007. – 224 с.
8. Степанов, Ю. С. Номинация, семантика, семиология (виды семантических определений в современной лексикологии) / Ю. С. Степанов // Языковая номинация. Общие вопросы ; отв. ред. Б. А. Серебренников, А. А. Уфимцева. – М. : Наука, 1977. – С. 294–358.
9. Телия, В. Н. Номинация / В. Н. Телия // Лингвистический энциклопедический словарь ; гл. ред. В. Н. Ярцева. – М. : Большая Рос. энцикл., 2002. – С. 336.
10. Телия, В. Н. О способах вторичной номинации – непрямой и косвенной / В. Н. Телия // Языковая номинация. Общие вопросы ; отв. ред. Б. А. Серебренников, А. А. Уфимцева. – М. : Наука, 1977. – С. 73–98.
11. Торопцев, И. С. Словопроизводственная модель / И. С. Торопцев. – Воронеж : Изд-во ВГУ, 1980. – 147 с.
12. Чагайда, Ю. Н. Ономасиологический портрет героев военных произведений В. Быкова и Б. Васильева: дис. … канд. филол. наук : 10.02.02, 10.02.01 / Ю. Н. Чагайда. – Минск, 2016. – 308 л.
13. Шур, В. В. Онім у мастацкім тэксце / В. В. Шур. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2006. – 215 с.
14. Ященко, Н. В. Наименования лиц женского пола в немецком языке: диахронический аспект : дис. … канд. филол. наук : 10.02.04 / Н. В. Ященко. – Самара, 2008. – 205 л.

# ПРАГМАТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СІНТАКСІЧНЫХ ДЭРЫВАТАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***Н. У. Чайка (Мінск, Беларусь)***

Апошнім часам прагматычны аспект моўных з’яў становіцца ўсё больш папулярным і запатрабаваным, бо шырокае разуменне прагматыкі ахоплівае шэраг актуальных пытанняў мовазнаўства. Лінгвістычная прагматыка вывучае мову як інструмент для дасягнення пэўных камунікатыўных мэт. Прагматычны патэнцыял тэксту і асобных моўных адзінак можа быць значным, фарміруецца ён на аснове канкрэтных прагматычных задач, якія спрыяюць дынамічнаму развіццю і ўдасканаленню камунікатыўных адзінак. Гэтыя фактары прадуцыруюць значную колькасць сінтаксічных дэрыватаў – канструкцый рэдукаваных, няпоўных, эліптычных, парцэляваных і сегментаваных. Змена аблічча сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы прыводзіць да стуктурнай фрагментарнасці канструкцый, нейтралізацыі сінтаксічных сувязей і адносін у іх, да скарачэння аб’ёму выказвання да мінімальнага, да выражэння прэдыкатыўнасці кантэкстуальна або імпліцытна. Падобныя з’явы актыўна даследуюцца вучонымі на сучасным этапе развіцця навукі.

Прагматычны аспект сінтаксічных канструкцый вывучаўся ў межах розных лінгвістычных школ і напрамкаў. Асноўным параметрам кваліфікацыі прагматычнай функцыі сінтаксічных дэрыватаў паслужылі тэарэтычныя асновы і метадалагічныя прынцыпы канкрэтнага лінгвістычнага напрамку. Асноўнай прагматычнай функцыяй структурна-сінтаксічных мадыфікацый лічылі лаканічнасць выказвання (Дж. Арма, М. Вішнеўскі, А. В. Грудзева [1–3]) і дыстынктнасць (К. Карлсан [4]), аналітызм (З. Выхадзілава, Т. А. Коласава [5; 6]).

Пры гэтым прагматычны патэнцыял сінтаксічных адзінак у беларускай мове не даследаваўся, таму неабходна выявіць асноўныя фактары дынамікі прагматычнага патэнцыялу беларускай мовы – тэндэнцыі да эканоміі і аналітызму, а таксама інфармацыйнае